
ЗГОДА
ПАЛІТЫКА
N 31 (167) • 28 КАСТРЫЧНІКА 2000Г.


НЕСОСТОЯВШЕЕСЯ РУКОПОЖАТИЕ

ДИПЛОМАТИЯ

ПОСОЛ США В СОЧИ НА ПОКЛОН

Алексей Король

Имя нового посла Соединенных штатов Америки в Беларуси — Майкл Козак — стало известно почти год назад. И вот, наконец-то он смог прибыть в Беларусь. Но официально, строго по дипломатическому протоколу, к исполнению своих обязанностей он приступит только после вручения верительных грамот главе государства. У нас на этом посту, как известно, самоуправно задержался Александр Лукашенко. В логике всей предыдущей истории с назначением и приездом нового посла США можно предположить, что торопиться он не будет. Не отказав себе в удовольствии мелкой мстительности.

Почти год не отвечал согласием официальный Минск на агреман нового посла. Причина тому на поверхности: твердая политика Америки в отношении Беларуси, как стране с недемократическим режимом и массовыми нарушениями прав человека. Жесткие заявления самого Майкла Козака, сделанные им тотчас после назначения послом в Беларусь, не оставляли сомнений, что проводить эту политику он будет столь же твердо. Попытка МИД РБ ответными обвинениями повлиять на решение США успехом не увенчалась. На прямой же отказ белорусские власти не решились. Хотя для них не была секретом деловая репутация Козака как опытного дипломата, к тому же специалиста по проблемным государствам. За плечами пятидесятилетнего посла 29 лет службы в Государственном департаменте. В последние годы возглавлял миссию, представляющую интересы США при посольстве Швейцарии на Кубе. Принимал участие в переговорах, направленных на урегулирование положения в Гаити, в Панаме и Никарагуа.

Оттяжка с ответом на агреман — в стиле старой дроздовской традиции: вести разговор с позиции силы, силы которой нет. Как и тогда она закончилась конфузом, хотя и не столь явным. Посол США прибыл в нашу страну буквально тотчас после выборов, после заявления США о непризнании их демократическими и свободными, после аналогичного заключения парламентской Тройки.

По прибытии еще в аэропорту Майкл Козак заявил: *«Мы считаем, что будущий год будет иметь очень большое и решающее значение для Беларуси в плане преодоления вашей страной изоляции. Я рад, что мне представилась возможность работать в Беларуси именно в этот период».* Этот период, как мы знаем, будет отмечен президентскими выборами, которые должны стать отправной точкой демократических перемен. ■

Визит Александра Лукашенко в Сочи для встречи с российским президентом можно было бы отнести к дипломатии высшего разряда. Если бы он столь явно не напоминал поездку вассала к сюзерену, или, сравнение из другого исторического ряда, к хану за ярлыком на правление. Внешний антураж встречи — длительная беседа, несколько дней гостевания — в данном случае ничего не меняют. Для начала Лукашенко необходимо было получить ярлык на признание Россией законности выборов, тем более, что подобного заявления со стороны официальной Москвы до визита не прозвучало. Интервью многочисленных российских гостей-наблюдателей за выборами не в счет. О поступивших якобы поздравлениях Путина сообщила только белорусская сторона. Но как ни пытался Лукашенко выпросить это признание, в ответ он услышал: *«Мы не вмешивались во внутренние дела».* Переговоры по унификации таможенного законодательства и разрешению давних проблем с платой за энергоносители в этом смысле тоже ничего не меняют.

Что бы это все значило? Во-первых, Лукашенко навсегда лишен роли инициатора и предводителя белорусско-российской интеграции, лидера славянского единства. Даже внешне он выглядел столь подобострастно и вел себя так заискивающе, что в том не осталось никаких сомнений. Во-вторых, Россия, сколь бы сложно и противоречиво не развивалась она сама, идет по пути рыночных реформ и, будем надеяться, демократических преобразований. Она нуждается в сотрудничестве с Западом и вынуждена учитывать мнение международного сообщества в отношении Беларуси. В связи с выборами это мнение еще раз прозвучало более чем ясно. В-третьих изменилась ситуация на континенте. С падением Милошевича в Югославии Беларусь осталась последним диктаторским заповедником. Лукашенко превратился слишком в одиозную политическую фигуру, чтобы поддерживать его открыто.

Вряд ли, конечно, российские власти принципиально изменят свою позицию в отношении Беларуси, которую они рассматривают исключительно в сфере своих государственных интересов. Но, похоже, что угроза непосредственного включения в состав России на какое-то время отступила. По всей вероятности, Лукашенко смирился с ролью вассала в обмен на сохранение его власти в Беларуси. Согласится ли Россия оставить его на этой роли? ■

ВЫБОР–2000

НЕ ГОЛОСУЙ, А ТО ПРОИГРАЕШЬ

Александр Кавальский

Закончилась кампания «Выборы–2000» (а для кого-то «Бойкот–2000»). Отсутствие шекспировских страстей в ее ходе лишь отчасти было компенсировано итогами. Даже по официальным данным выборы не состоялись в тринадцати округах: полностью в Витебске, Бресте, Барановичах, Борисове, частично в Минске. Власти тоже есть чем гордиться: с первого тура были избраны В. Коноплев, В. Янчевский, И. Пашкевич, В. Кучинский, А. Малофеев.

КРУЧЕ «СОЛИДАРНОСТИ»

Казалось, даже сами зачинщики кампании не верили в успех бойкота, заранее оправдываясь, что пока народ не изжил выборных иллюзий. Но бойкот состоялся, несмотря на противодействие властей и социологические прогнозы о вроде бы приличном проценте явки на избирательные участки 15 октября.

То, что не смогла сделать польская «Солидарность» в 1984, когда, по данным независимых наблюдателей, был самый низкий процент избирательной активности в истории ПНР (Варшава — 57, Гданьск — 52 процента), сделали белорусские бойкотеры и серая, невнятная, малозаметная конкуренция кандидатов в нацсобранцы. Сейчас противники бойкота уже говорят, что кампания «Бойкот–2000» тут не при чем, а низкая явка традиционна для Беларуси с 1995 года.

Но в 1995 выборы в Верховный Совет срывались не в первом туре, а во втором, где по старому законодательству необходимо было преодолеть непосильный барьер в 50 процентов. В первом же туре до урн доходило до 60 процентов избирателей даже в Минске. В столице же в декабре 1995 со второго тура был избран цвет тогдашней оппозиции: Карпенко, Шушкевич, Богданкевич, Калякин, Данейко. Это при том, что вертикальщики специально ездили по участкам и срывали явку.

КОППЕРФИЛЬД ОТДЫХАЕТ

Даже потеряв пост председателя ЦК по выборам и проведению референдумов, Лидия Ермошина не останется без куска хлеба. Навыки, приобретенные в Центризбиркоме, она успешно сможет применять, работая иллюзионисткой. Ловкое трехдневное жонглирование протоколами участковых и окружных избирательных комиссий не настораживало разве что наших стратегических партнеров из стран образцовой демократии — Кубы, Ирана, Ирака, Ливии — да яблочника Игрунова.

Кстати, тот еще фрукт оказался: позавидовал нашей организации выборов и заявил, что будет всюду поднимать вопрос о международном признании этой палатки легитимным белорусским парламентом. Как говорит Виктор Шендерович, лизнул режим аж до гланд.

Окончание на с. 4



АНЕКДОТ-С

Пациент — врачу:

— Понимаете, доктор, у меня, что-то с головой...

— А в чем это проявляется? Какие симптомы?


— Тревожные, доктор, симптомы. В последнее время все, что говорит президент, кажется мне разумным.

* * *

Белорус — русскому:

— Хороший у нас президент. Ваш только пенсии поднимает, а наш все время минимальную зарплату повышает и повышает, повышает, повышает, повышает, идиот!!!

ХИТ-ПАРАД ГЛУПОСТИ: ИТОГИ МЕСЯЦА



ЗАДАВИЛИ

«Очень давит на меня их талант, и это компенсирует мою власть»

(А. Лукашенко, посещение Университета культуры, 6.10.00)



ДЕФИЦИТ

«В городе очень мало депутатов»

(Т. Филимончик, председатель Советского райисполкома Гомеля, «АТН» 1.10.00)



КГБ

«Лица школьников светились улыбками от встречи с представителями национальной спецслужбы»

(И. Степуро, «Рэспубліка», 18.10.00)

НАВІНЫ

КРЭДЫТ. Міжнародны валютны фонд лічыць немагчымым выдаткаванне Беларусі стабілізацыйнага крэдыту, якога просяць беларускія ўлады. Гэты крэдыт МВФ можа выдаць толькі пасля таго, як Беларусь выканае праграму рэформаў пад назіраннем МВФ.

ЭМІСІЯ. У Нацыянальным банку Беларусі па-ранейшаму лічаць, што адзіны эмісійны цэнтр Саюзнай дзяржавы павінен дзейнічаць на парытэтных падставах. Кіраўніцтва галоўнага банка Беларусі прытрымліваецца пазіцыі, згодна з якой адзіны эмісійны цэнтр павінен уяўляць сумесную структуру накшталт Еўрапейскага цэнтральнага банка. У пытаннях эмісіі Беларусь і Расія павінны мець роўныя правы. У адваротным выпадку гэта будзе азначаць страту краінай часткі свайго суверэнітэту.

ПЕРАРЭГІСТРАЦЫЯ. Кіраўніцтва Беларускай асацыяцыі журналістаў накіравала ліст кіраўніку Адміністрацыі прэзідэнта Міхаілу Мясніковічу з нагоды рашэння аб перарэгістрацыі друкаваных выданняў да 1-га студзеня 2001-га году. Большасць газет і часопісаў нават фізічна не ў стане гэта зрабіць. Узнікла рэальная пагроза знікнення вялікай колькасці недзяржаўных выданняў.

АДКРЫТЫ ЛІСТ. Прадстаўнік АБСЕ па свабодзе сродкаў масавай інфармацыі Фраймут Дувэ накіраваў міністру замежных спраў Беларусі Уралу Латыпаву адкрыты ліст, у якім выказаў занепакоенасць дзеяннямі беларускіх уладаў у дачыненні да выдавецкага дома «Мэджык». На думку Дувэ, перашкоды дзейнасці выдавецкага дома з'яўляюцца актам, скіраваным супраць незалежнай беларускай прэсы, што, у сваю чаргу, *«відавочна і груба парушае асноўныя дэмакратычныя прынцыпы і супярэчыць абавязацельствам гарантаваць асноўныя ўмовы для свабодных і незалежных сродкаў масавай інфармацыі, як адзначана ў Хартыі еўрапейскай бяспекі, што была падпісана усімі краінамі-удзельніцамі Стамбульскага саміту АБСЕ, у тым ліку Беларуссю»*.

КАНФЕРЭНЦЫЯ. У Раўбічах пад Мінскам завяршылася Міжнародная канферэнцыя «Праблемы дзяржаўнага будаўніцтва ў перыяд дэмакратычных пераўтварэнняў». Форум ладзіла грамадскае аб'яднанне «Цэнтар па правах чалавека», якое ўзначальвае вядомы адвакат Вера Страмкоўская. У канферэнцыі ўзялі ўдзел прадстаўнікі дэмакратычных палітычных партый, грамадскіх арганізацый, чальцы Канстытуцыйнага суда, сябры ўсіх праваабарончых арганізацый Беларусі (за выключэннем Беларускага Хельсінскага камітэта), юрысты і праваабаронцы з Польшчы, Велікабрытаніі, Расіі.

СУДОВАЯ СПРАВА. Старшыня АГП Анатоль Лябедзька падрыхтаваў іск у суд супраць Аляксандра Лукашэнкі. Прычынаю стала нядаўняя заява Лукашэнкі пра тое, што прадстаўнікі міжнародных структур, нібыта, аказваюць фінансавую дапамогу лідэрам апазіцыі і асабіста Анатолю Лябедзьку. Выступаючы 15 кастрычніка перад журналістамі, Аляксандар Лукашэнка тлумачыў, дзеля чаго апазіцыя днём раней арганізавала ў Мінску акцыю, на якой прысутнічалі міжнародныя назіральнікі. Як сказаў Лукашэнка: *«Вы думаце, чаго яны сабраліся? Трэба ж было даказаць, што паўтары тысячы даляраў дапамогі адразу Лябедзьку ня проста так даюць...»*.

КРЫТЭРЫ. Удзельнікі чарговага паседжання соймаў БНФ «Адраджэнне» і партыі БНФ ухвалілі крытэры падбору кандыдата ў прэзідэнты ад аб'яднанай дэмакратычнай апазіцыі. На думку сяброў БНФ, адзіны кандыдат у прэзідэнты мусіць мець непахісную незалежніцкую пазіцыю, быць гатовым да рэформаў, ацэньваць ролю беларускай культурнай умовы, дасканала валодаць дзяржаўнай мовай. У шэрагу сфармуляваных крытэрыяў звяртаюць увагу такія характарыстыкі для будучага прэзідэнта, як прэзентабельны выгляд, камунікабельнасць, прымальнасць для сталіцы і рэгіёнаў, аўтарытэт сярод розных элітаў.

ДАЗВОЛ. Мінгарвыканкам дазволіў прадстаўнікам БНФ «Адраджэнне» і Кансерватыўна-хрысціянскай партыі БНФ арганізацыю шэсця і мітынгу 29 кастрычніка, прысвечаных Дню памяці продкаў. Збор удзельнікаў шэсця пачнецца а 11.30 у скверы на бульвары Талбухіна (станцыя метро «Парк Чалюскінцаў»). З 12 да 15 гадзінаў запланавана шэсце па праспекце Скарыны да ўрочышча Курапаты. Згодна са старажытнай хрысціянскай традыцыяй, удзельнікі акцыі будуць несці свечкі і крыжы. З 15-ай да 17-ай гадзіны ў Курапатах пройдзе мітынг-рэквіем. На магілах ахвяраў рэпрэсій будуць усталяваныя крыжы.

ПРАФСАЮЗЫ

УЦІСК ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Тацьцяна Папова

Тры дні, што дэлегацыі ад Міжнароднае арганізацыі працы (МАП) правялі ў Беларусі, зрабілі на іх цяжкае ўражаньне. Настолькі цяжкае, што госьці Фэдэрацыі прафсаюзаў (беларускай) пакінулі краіну, не камэнтуючы вынікаў сваёй азнаямленчай вандроўкі.

МАПаўцы, натуральна, чыталі скаргі ад аб'яднаных незалежных прафсаюзаў, але рэальны маштаб уціску ўлад на дзейнасьць прафструктур апынуўся шакіруючым для замежнікаў.

Прафсаюзы лучаць велізарную колькасьць народу, незадаволенага сваім існаваньнем. Заводзкім ды фабрычным працаўнікам шмат ня трэба: былі б умовы працы прыстойныя й заробкі высокія. Кіраўніцтва прадпрыемстваў ня здольнае задаволіць гэтых патрабаваньняў, таму людзі аб'ядноўваюцца, каб змагацца за свае правы. Супраць каго будзе скіраваная агрэсія, залежыць ад тых, хто ўзначальвае прафсаюзы. Таму палітычная актыўнасьць кіраўнікоў прафаб'яднаньняў непакоіць улады.

Для вырашэньня праблемы не знайшлі нічога лепшага, як зьмяніць кіраўніцтва непадпарадкаваных дзяржаве прафсаюзаў. Але ў часе зьездаў шарагоўцы адзінадушна галасавалі за Ярашука, Бухвостава, Фядыніча, ігнаруючы вылучаных стаўленікаў улады. На фэдэрацыйным зьездзе міністры ўжо не рызыкнулі прапанаваць альтэрнатыўных старшыні ФПБ Уладзімеру Ганчарыку кандыдатаў.

Зразумеўшы, што моц прафсаюзаў у іх еднасьці, улады прыдумалі, як гэтую еднасьць парушыць. Традыцыйныя глябальныя расколы вымагаюць важкага пункту, па якім мусяць разыходзіцца меркаваньні апанэнтаў. Прычыны сварыцца прафсаюзы ня мелі. Таму паслабляць калектыўную моц згуртаваных працаўнікоў пачалі ціхай сапай, разьдзяляючы буйныя галіновыя арганізацыі на мноства дробных утварэньняў на прадпрыемствах.

Кіраўнікам заводаў і фабрык загадваюць стварыць лякальныя аб'яднаньні, а з прафактывамі існуючых суполак галіновых прафсаюзаў праводзяць тлумачальныя размовы. Ініцыятары стварэньня новых-старых прафсаюзаў на прадпрыемствах забываюцца на тое, што такое аб'яднаньне можа быць створана толькі па жаданьні саміх працаўнікоў, чым парушаюць канвэнцыю МАП. Калі ж ФПБ скардзіцца міжнародным прафсаюзьнікам, беларускія ўлады, каб надаць сваім дзеяньням якое-кольвечы адценьне законнасьці, заахвочваюць шараговых працаўнікоў абяцаньнямі паменшыць памеры ўнёскаў.

Разам з гэтым на ФПБ натравілі падатковую інспэкцыю. Не пасьпявае адна камісія запакаваць свае пячаткі й калькулятары, як на парозе зьяўляюцца новыя правяраючыя. Пасьля (але ня ў выніку) аднаго з апошніх рэйдаў напярэдадні выплаты заробкаў тэхнічным працаўнікам Фэдэрацыі знойку былі зачыненыя разьліковы рахунак. Больш як месяц падатковая інспэкцыя й ФПБ ня могуць паразумецца.

Замежнікі абяцалі вярнуцца ў другой палове лістападу. Да гэтага часу шляхі вырашэньня праблемаў беларускіх прафсаюзаў будуць абмяркоўвацца на нарадах у МАП. ■

ПАЛІТЭКАНОМІКА

БЮДЖЭТ '2001

Тацьцяна Папова

Міністар фінансаў Мікалай Корбут 24 кастрычніка меркаваў сустрэцца з журналістамі, каб падагульніць плён высілкаў па стварэньні бюджэту на 2001 год. Але ярмошынскае запрашэньне на паседжаньне міністэрскае рады перакрэсьліла ягоныя пляны. У міністэрстве палічылі: каб зьмяніць Корбута, спатрэбіцца ня менш як пяцёра іншых супрацоўнікаў гэтае ўстановы.

У Палацы прадстаўнікоў Нацсходу разглядалі аптымістычны варыянт бюджэту (існаваў яшчэ й рэалістычны). Дэпутаты ўнесьлі ў дакумэнт толькі тэкставыя праўкі. З усімі лічбамі яны згаджаліся. Іх задавальнялі й 131 млрд. BYB, выдаткаваны на падтрыманьне ўрадлівасьці глебы, і 36,8 млрд. BYB для дзяржаўных СМІ, і 12 млрд. — на правядзеньне выбараў.

Па словах намесьніка міністра фінансаў Анатоля Сьвеража, агульная нагрузка на тых, хто плаціць падаткі, будзе зьніжаная. Гэтага можна будзе дамагчыся, аб'яднаўшы выплаты ў фонд садзейнічаньня занятасьці насельніцтва й надзвычайны падатак. Пасьля збору грошай прапарцыйнае размеркаваньне будзе захаванае. Разам з гэтым, з 25 да 30 адсоткаў павялічыцца падатак на прыбытак. Раней гэтую мэру зьвязвалі з уніфікацыяй расійскага й беларускага заканадаўстваў. Але ўсходнія суседзі не зьбіраюцца ўздымаць стаўку вышэй 13 адсоткаў. Прыдумаць новага тлумачэньня сваім рашэньню міністэрскія чыноўнікі не здолелі.

У наступным годзе працягнецца фармаваньне фонду падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчае прадукцыі. Зь яго будуць фінансавацца дзяржаўныя праграмы па нарыхтоўцы грыбоў, гадаваньні парсючкоў ды цялушак. Акрамя таго, захаваюцца падатковыя прэфэрэнцыі для калгасьнікаў.

Выдаткі на ліквідацыю наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС абмяжоўваюцца 240 мільярдамі BYB. Большую частку грошай патрацяць на кампэнсацыйныя выплаты жыхарам забруджаных раёнаў краіны. Капітальных укладаньняў амаль ня прадугледжваецца. Па словах аднаго з прысутных чыноўнікаў, ваенны бюджэт краіны ў 1,5 разы меншы за аварыйна-чарнобыльскі. Такое параўнаньне не зусім карэктнае, бо бюджэт задавальняе толькі 10-ую частку патрэбаў вайскоўцаў.

У 2001 годзе палепшыцца жыцьцё праваахоўных органаў. Дадатковыя грошы прызначаюцца для дзяржаўных праграм па барацьбе з наркаманіяй і злачыннасьцю. Намесьнік міністра запэўніў, што сродкі будуць патрачаныя на новае абсталяваньне для міліцыянтаў, а не на прыцягненьне да супрацоўніцтва новых кадраў.

Зьнешняя запазычанасьць Беларусі цяпер складае 828 млн. USD. Зь ліпеня яна паменшылася толькі на 11 мільёнаў. Каму пашчасьціла атрымаць гэтыя грошы ніхто зь пяцёх чыноўнікаў ня ведае. У наступным годзе яны маюць намер працягнуць разьлікі з замежнікамі. ■

СУД ИДЕТ

ВРЕМЯ, НАЗАД

Александр Кавальский

20 октября был оглашен приговор Юлии Чигирь. За оказание сопротивления работнику милиции суд приговорил ее к двум годам тюремного заключения с отсрочкой приговора на год.

В своем заключительном слове подсудимая попыталась напомнить суду, что мы живем не в Средневековье с его правом сильнейшего, а в конце ХХ века. Именно средневековый принцип «господин всегда прав», по мнению Юлии Чигирь, был положен в основу всего процесса. Она же виновна лишь в том, что позволила себе препятствовать беззаконию этого господина и его слуг. Суд своим решением должен был либо узаконить эту временную аномалию, либо подтвердить приверженность принципам правового государства.

На следующий день вынесение приговора было задержано больше чем на час. Собравшиеся журналисты, родственники, представители посольств, скучая, смотрели на настенные часы в зале заседания. Часы стояли. Не шли и другие часы в здании Фрунзенского районного суда, будто подтверждая метафору подсудимой. Кажется, приговор никого не удивил, все были к нему внутренне готовы. Все уже привыкли жить во временной яме. ■

РЭГІЁНЫ

ВІЦЕБСК

21 кастрычніка каля 20 сябраў Маладога фронта і маладзёвай арганізацыі АГП правялі ў цэнтры Віцебска каля абласной бібліятэкі несанкцыяваны пікет пад лозунгамі: «Не — выбарчаму фарсу», «Не — расейскай экспансіі». Праз 45 хвілін ад пачатку пад'ехала міліцэйская машына і хлопцаў павезлі ў пастарунак, дзе пасля складання пратаколаў адпусцілі. Тыя, хто падчас хапуна схаваўся, аднавілі пікет. Спыніць яго міліцыянтам удалося толькі пасля другой экспедыцыі.

* * *

Мытны камтэт Беларусі выдаў пастанову, каб на мяжы з Расіяй праводзіць разтаможку і плаціць пошліну ў памеры ад 20 да 30 працэнтаў кошту тавару. З гэтай нагоды 23 кастрычніка ў Віцебску ў памяшканні кінатэатра «Мір» сабралася паўтары сотні прадпрымальнікаў. Па іх словах, такі ціск здольны вытрымаць толькі вялікія фірмы. Прадстаўнікі прафсаюза прадпрымальнікаў абурыліся дзеяннямі віцебскага АБЭЗа, які канфіскаваў тавары часткі прадпрымальнікаў у Оршы. Але рашэнне падтрымаць аршанцаў страйкам не прайшло. Па прапанове гарадзенскага госця Валерыя Леванеўскага, прысутныя абмежаваліся лістом салідарнасці. ■

СОЮЗ НЕРУШИМЫЙ

ПЕСНЯ БЕЗ СЛОВ

Алексей Маковец

Пока идеи, консолидирующие общество, не прописаны, сочинять слова для гимнов рановато.

СЛАВЬСЯ, СЛАВЬСЯ!

С финалом ельцинской эпохи финишировала и русско-советская идентичность. На последних выборах российский брат белорусов окончательно нейтрализовал красно-коричневый элемент. В имперском декоре, у клумбы-триколора, под фанфары, литавры и кивера, инаугурировался Владимир Путин.

И все бы славно, только Россия так и осталась с полугимном, музыкой без слов. И кликнул кличь президент всея Руси Владимир Путин сочинить слова для государственного гимна. Ибо раз есть государство Российское, так полагается гимн, ну и слова в гимне, чтоб в них была некая идея. Идея, объединяющая граждан государства вокруг некой общей модели сосуществования, друг с другом и другими народами. *Славься, славься, родная земля!*

ГОВОРИТЬ ПОКА НЕ О ЧЕМ

Президент Путин запросил слова гимна для *новой* России. Для новой — значит, в гимне должны выражаются некие базисные, очень долгосрочные ориентиры развития России. Но в то же время, гимн должен намекать на некую историко-культурную российскую самость.

Вот с нею, с самостью, одной на всех россиян, и выходит проблема. Отсутствие слов до сей поры в российском гимне — симптом еще тот. Ни базисные ориентиры, ни российская, от Терека до Камчатки, от Смоленска до Владивостока самотождественность, до сих пор внятно на словах не проговорена.

Сочинители слов к новому российском гимну оказались как тот пелевинский герой из «Генерации «Пи». Ему авторитет Вовчик Малой заказал русскую идею на нескольких страницах. А вот с новой русской идеей и облом-с. Подлинно советских обитателей в России уже нет, а новая наднациональная общность не народилась пока. Такая, чтоб этнический татарин из глубинки с этническим русским из Москвы были как равные и оба — братья навек.

БОЖЕ, ЦАРЯ ВЕРНИ!

В непростой ситуации межнационализма и непрописанной российской самости не преминула тряхнуть собой русско-советская старина. «Боже, царя храни», но без царя, и гимн СССР, но без КПСС. Людям монархического пошиба, да советского пошива, вроде Никиты Михалкова, вполне подойдет. Только тогда пускай мастер культуры не обижается на иронию просвещенного мира в российский адрес.

Большевистский гимн был советским, но не был российским. Большевики аннулировали российскую историю как предысторию, и — вперед, к торжеству коммунизма. Так же, но куда радикальнее, Россия порешила монархию. Оба гимна устарело-несуразны, — и на текущий момент, и в обозримо отдаленном будущем.

Чтобы страна получила нормальный гимн, ей нужен период внутренней стабилизации. Нужен срок, чтобы кристаллизовался общий ценностный стандарт в умах граждан, одинаковое отношение к великой Родине.

Поелику Россия велика, многонациональна и всяко-разно конфессиональна, консолидироваться ей надобно с учетом своей специфики. Не по линии великорусско-монархической, советско-космополитической или православно-славянской. Ценности демократии и свободы — вот и основа для будущих Соединенных Штатов России, и базовая идея гимна. Только надо будет как-то историко-культурного колорита добавить. Да, тут еще думать надо.

А МЫ, БЕЛОРУСЫ, С КЕМ-ТО ТАМ ЕЩЕ.

Ладно, что нам Россия, у нас тут своя независимость с президентской вертикалью. Российские гимнописательские потуги



были б нам потехи вроде, — кабы у самих рожа прямая. А то ведь тоже, как та, не в меру братская Россия, — ни те внутреннего единства нации, ни те всеми принятых базовых идей консолидации. И это еще покруче, чем у дорогих многонациональных россиян. Мы, вроде как, все больше этнонационально едины. А вот поди ж ты.

Основной смех и грех белорусского гимнописательства в том, что до собственного своего гимна у нас никак голова не доходит. Застреваем на союзных песнопениях с Россией. Страна-сателлит *не мыслит себя без большого российского брата.*

БЕЛОРУССКИЕ РОВНЕЕ

И вот по Великим и Белым Русям дана установка отыскать слова для гимна русско-белорусского союза. Какая тут может содержаться базовая идея, выраженная в словах — тайна велика. Наверное, это будет что-то в духе «все славяне равны, но некоторые — ровнее». Неизвестно, как гимнописатели-комписы будут объяснять, почему русские и белорусы таки братья, да без украинцев. Почему, опять же, именно белорусы с русскими союзничают на особых правах, *а не татары — тоже проблема.* Роль татар в русской истории тоже, ой как неоспорима. Или якуты, чьей землей и недрами российское отечество немало приросло.

Для русско-белорусского гимна надобно бы выдумать этакую особую, бело-российскую, русскую-белорусскую идею. И гимн соответственный. Чтоб оправдывался сей странный перекос в восточном славянстве.

Труд литобслуги еще и тем усложнился, что Россия все ж таки движется к обществу либеральному и постиндустриальному. Беларусь же, самая союзная из союзных, практикует авторитаризм и *сползает* в доиндустриальное состояние. Общего у нас с Россией на самом деле мало, и с теченьем лет — все меньше. Какой уж тут гимн.

Парламентская ассамблея «Россия & Б^{0}» приняла вот советский гимн. Владимир Путин несказал, что против. Теперь он не против приспособить советскую мелодию для российского гимна. Наверняка, и ему, и новой элите белроссоюз глубоко до фонаря. Вперед, господа красно-коричневые, поворачивайте время назад, коли охота. Новая Россия с дикарями одной дорогой все равно не пойдет.

ПО МИНСКОМУ ВЕЛЕНИЮ С МОСКОВСКОЙ ПОДАЧИ

Возможно, проблемы гимна союзного удастся обойти, когда Беларусь определиться с собственным гимном. Раз уж мы особые братья русских, надо бы проговорить, какие именно и чем особенные.

Заявка большого российского брата на персональный гимн со *словами подвинет и заштатную* Бело-Русь туда же. По принципу суперкомпенсации, не имея реальных достижений на фоне России, белорусский режим, скорее всего, тоже займется державным гимносочинительством.

Так что местная-местечковая литобслуга имеет все шансы получить разнарядку на слова к белорусскому гимну. Только как бы у нее снова не получилось, что мы — белорусы, только не сами, а с кем-то еще.

■

FROM BYELORUSSIA WITH LOVE


ЛЕПЕЙ ПОЗНА, ЦІ НІКОЛІ

Тацьцяна Папова

ААН ёсьць бадай адзінай арганізацыяй, зь якой у Беларусі ўсталяваліся ў большай ці меншай ступені станоўчыя дачыненьні. У сваіх рэйтынгах па эканамічным разьвіцьці, да радасьці беларускіх уладаў, ААН зьмяшчае нашу краіну на 57 месца ў сьвеце.

На недэмакратычныя ўнутрыпалітычныя зьвы, якія выклікаюць абурэньне астатніх міжнародных структураў, ААН глядзіць скрозь пальцы. Беларускае кіраўніцтва вельмі цешыцца з гэтага. Справаздачы Кофі Анана застаюцца адзінымі афіцыйнымі паперамі, якімі можна адказаць на *апазыцыйныя скаргі* ў эўрапейскія дэмакратычныя інстытуцыі.

Прадстаўніцтва Беларусі ў ААН ня ёсьць паказальнікам яе цывілізаванасьці. Ратыфікацыя статуту гэтае арганізацыі не патрабуе дасягненьня міжнародных стандартаў па ўзроўні эканамічнага ці палітычнага разьвіцьця. Хутчэй наадварот. Гэтая арганізацыя не адмовіла ў сяброўстве й зімбабвійскаму дыктатару, які напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў, загадаў праваахоўным органам сваёй афрыканскай радзімы прымяніць фізычны ўціск на прыхільнікаў апанэнта.



Статус краіны-заснавальніцы стаўся перадумовай намінальна-паважлівага стаўленьня іншых чальцоў арганізацыі да Беларусі. Але дазвол беларускаму прэзыдэнту праціснуцца ў першы шэраг на калектыўным фотаздымку ААН і тэзысна выкласьці ўсяму сьвету беларускі погляд на ролю арганізацыі ў кантэксьце ўсясьветнае палітыкі не вылучылі Беларусь з ААНаўскае масоўкі. Спадзяваньні ж беларускае дэлегацыі праціснуцца ў Раду бясьпекі ад пачатку ня мелі пад сабой грунту. Пакуль усходне-эўрапейскі рэгіён прадстаўлены ў Радзе Украінай. Таму да 2002 году Беларусі стаць дарадцам па бясьпецы нават тэарытычна немагчыма.

У заяве, падпісанай на Саміце тысячагодзьдзя, місыянэры ААН выказалі жаданьне пазбавіць людзей сьвету ад галечы й войнаў, дасягнуць пэўнага прагрэсу ў абароне дзяцей і людзей з групаў рызыкі. Па меркаваньні Ніла Бунэ, які ўзначальвае прадстаўніцтва ААН у Беларусі, прыгожыя словы нічога ня вартыя, калі ў адпаведных рэгіёнах ня будуць прымацца мэры па дасягненьні дэкляраваных мэтаў. Беларусь, на думку Бунэ, ёсьць вельмі пэрспэктыўным рэгіёнам для дзейнасьці ААНаўскае місыі. Краіна, дзе лекараў на душу насельніцтва прыходзіцца ўдвая больш, як агулам па Эўропе, дзе ўзровень пісьменнасьці насельнікаў набліжаецца да 100 адсоткаў, мае патэнцыял для ўзбагачэньня.

Але, каб атрымаць дапамогу ад ААН, трэба гуляць па яе правілах. Ніл Бунэ адмовіўся камэнтаваць вынікі парлямэнцкіх выбараў, хаця *яго арганізацыя мела права й была* запрошаная да назіраньня. Бунэ кіраваўся ААНаўскім статутам, які патрабуе, каб запрашэньне было зробленае не пазьней як за 3 месяцы да тэрміну выбараў. Цэнтарвыбаркам згадаў аб ААНаўцах толькі напачатку верасьня.

Прадстаўніцтва Усясьветнага банку, дзейнасьць якога падпарадкаваная прынцыпам ААН, пакуль працягвае сваю дзейнасьць.у Беларусі. Але ранейшае спрытнасьці й жаданьня дапамагчы ўжо *не назіраецца.* Васьмёхгадовыя высілкі й фінансавая дапамога не прынесьлі жаданага плёну.

Пры гэтым кіраўнік беларускага прадстаўніцтва банку нагадаў, што грошы, атрыманыя краінай з 1992 году, не падарунак, і рана ці позна іх давядзецца вяртаць.

■

ПО СТРАНАМ И КОНТИНЕНТАМ

ХОРВАТИЯ. Хорватское правительство выступило с протестом против решения Евросоюза предоставить Югославии срочную финансовую и иную помощь, не увязывая это с требованием выдачи Слободана Милошевича Международному трибуналу. Нынешнему хорватскому премьеру завидно, так как ему самому потребовалось приложить массу усилий, чтобы выполнить требования международного сообщества и преодолеть изоляцию, в которой Хорватия находилась в годы правления Демократического союза (партия бывшего авторитарного главы государства Туджмана). Именно из-за сотрудничества с Уголовным трибуналом по бывшей Югославии падает рейтинг нынешнего руководства в среде ветеранов войны 1991–1995 годов, многие из которых виновны в нечеловеческом обращении с сербами.



ПОЛЬША. Пока новоизбранный президент Польши Александр Квасневский собирает поздравления и поцелуи, проигравший лидер AWS Марьян Кшаклевский — подзатыльники от товарищей по коалиции. Против него взбунтовались малые правоцентристские партии, входящие в AWS, обвиняющих Кшаклевского в авторитарном стиле руководства и других грехахх. Теперь они требуют отставки Кшака и реформ в коалиции. Не исключено, что к новой AWS присоединится и Лех Валенса (набрал на прошедших выборах меньше процента) со своей Христианско-демократической партией.


ФРАНЦИЯ. Из-за обострения израильско-палестинских отношений во Франции участились случаи антисемитских выступлений и поджогов синагог. В последние несколько недель их было зарегистрировано около 90. Еврейская диаспора во Франции одна из самых больших и влиятельнейших — 700 тысяч человек. *Но даже она не в силах противостоять пятимиллионной* мусульманской общине.



ФИЛИППИНЫ. Филиппинская объединенная оппозиция начала процесс импичмента президента страны Джозефа Эстрады. Его обвиняют в присвоении 8,7 миллиона американских долларов от *незаконной лотереи и в других сомнительных делишках.* Несмотря на многочисленные акции протеста в центре Манилы, эксперты пессимистично оценивают перспективы импичмента. Для того, чтобы начать рассмотрение дела, необходимы 75 (одна треть) подписей депутатов нижней палаты парламента, которая на 80 процентов контролируется самим Эстрадой. Пока есть чуть больше 40 и, кажется, это предел.

ПОЛЬША. Небольшой скандал разразился в связи с трансляцией по польскому телевидению документального фильма «Иоанн Павел II — Папа тысячелетия». Фильм содержал легкую критику позиций Папы в отношении абортов, разрешения женщинам принимать сан священника, указывал на недостаточное внимание костела к таким проблемам, как голод и смертность.

После показа ленты с протестом выступили депутаты Сейма от AWS, а примас Польши Юзеф Глемп высказался в том смысле, что на телевиденье все еще полно людей, воспитанных в духе марксизма-ленинизма, желающих поддеть костел. По иронии судьбы, за показ этого документального фильма ответственен шеф редакции католических программ телевидения ксендз и по совместительству член ордена иезуитов Кшиштоф Ольдаковский.



ТРАНСПАРТ

ЦЯГНІК, ЯКІ ЗАЎЖДЫ СПАЗЬНЯЕЦЦА

Арыя Гатальская

Па панядзелках цягнік № 95 Гомель—Менск спазьняецца на 10–20 хвілінаў з упартай рэгулярнасьцю. Паводле постасвецкіх уяўленьняў аб камфорце, абслугоўваньні й абавязках фірмы перад кліентам, нейкія 20 хвілінаў здаюцца такой лухтой.

Беларуская чыгунка ў эксСССР была і пакуль застаецца адной зь лепшых. Але як жа са спазьненьнямі, некультурным абслугоўваньнем, атручэньнямі чыгуначнай ежай? Тут пакуль усё ў лепшых саўковых традыцыях. І калі нехта ўсур'ёз усприймае магчымасьць спагнаць *«за маральную й фізічную шкоду»*, хай менеей глядзіць фільмы пра правы кліента за мяжой.

Большае, што вы можаце атрымаць, гэта даведку, у якой будзе напісана, на колькі спазьніўся цягнік. Яшчэ ёсьць магчымасьць выказацца ў кнізе водгукаў, калі, вядома, вы яе даб'ецеся. Тут жа вам дадуць тлумачэньні, чаму спазьніўся цягнік. Як заўжды, вінаватыя машыністы (а чаму ня стрэлачнік?), бо прапускалі сустрэчныя лакаматывы. Тлумачэньне дзіўнае, калі ўлічыць, што расклад руху складаецца (ці, прынамсі, павінен) з улікам усіх сустрэчных цягнікоў, якія таксама мусяць хадзіць па графіку.

Прыкладна такая ж сітуацыя зь медыцынскай страхоўкай. Трэба, як мінімум, патрапіць пад той цягнік ці быць прыцiснутым паміж ягонымі буферамі, каб атрымаць нейкую кампэнсацыю. І тое, калі зможаце даказаць, што адбылося гэта не па вашай віне.

Спазьняюцца беларускія цягнікі й з сэрвісам. Увогуле, сэрвіс цяпер практычна эўрапейскі, толькі дамешкі, дэталі часам моцна нагадваюць нешта даўно знаёмае. Зусім нядаўна ў фірменных цягніках (даплата за фірменнасьць уключаецца ў кошт квітка) падчас паездкі пажырэў забаўляла музыка. Цяпер яна ўключаецца на менскамельскіх маршрутах зрэдзьчас ды й месяцамі круціцца дзясятак адных і тых жа песень сумнiцельнай мастацкай вартасьці.

Была нейкі час на цягніках гомельскага фармаваньня неблагая завядзёнка. Запісаная на стужку праграма са спадарожнай інфармацыяй ішла па-беларуску й рускy. Неўзабаве, пад пэўнымі павевамі часу, беларуская мова зьнікла. Засталася толькі пара фразаў на пачатку, ды й тыя тут жа, усьлед, перакладаюцца. Яшчэ раз падкрэсьлю, што робіцца гэта на міжабласным цягніку мясцовага фармаваньня.

Палітычныя павевы кранулі нават дэкор салонаў. У сядзячых вагонах рэлаксацыйна-ружовыя фіранкі й блакітныя клятчастыя чахлы крэслаў зьнiклі, а на іх месцы цяпер красуюцца выключна дрэннага густу рэчы ў брудна-чырвоныя й атрутна-зялёныя паскі. Не сьцьвярджаю на ўсе сто, але прыглядзьцеся, як у прэзідэнцкія чырвоны й зялёны прыбіраюцца сталічныя крамы, прыпынкі, гандлёвыя шэрагі, імітуючы іх расклад і масавую суадносьнасьць. ■

МОЛАДЗЬ

АСВАЕНЬНЕ ПРАСТОРЫ

Мікола Рэчыцкі

Сучасная глябальная інфармацыйная прастора робіць кожнага з нас заняволеным чалавекам. Калі ты ня думаеш — спажывай, калі ты сумняваешся — спажывай, калі ты пратэстуеш — усё адно спажывай!... Чалавеку ў глябальным спажывецкім грамадстве адводзіцца роля пасыўнай істоты. У такой сытуацыі неабходна любымі сродкамі зьмяняць сваю падпарадкаванасьць абставінам. Не выступаць у якасьці аб'екту ўплыву, перахопліваць ініцыятыву, ламаць навязаныя стэрэатыпы паводзінаў — гэта завецца пратэстам.

Акцыі, зладжаныя антыпартыйнай групай «Чырвоны Жонд» апошнім месяцам, — гэта новы віток разьвіцьця беларускага моладзевага пратэсту. Пакаленьне, заціснутае паміж традыцыйнымі ўладнымі й апазыцыйнымі мадэлямі паводзінаў, знайшло новы шлях самарэалізацыі, неад'емна сплавіўшы культурны й сацыяльны пратэст.

Першай ластаўкай стала акцыя «Асваеньне прасторы» падчас верасьнёўскіх беспарадкаў у Чэхіі. Пакуль дэманстранты засвойвалі вуліцы Прагі, у беларускай сталіцы адбылося скватаваньне (захоп) будынку ў самым цэнтры гораду — зьява амаль трывіяльная для эўрапэйскай контркультуры. На некалькі гадзінаў, насуперак усім адміністрацыйным кодэксам, сярод беларускай сталіцы ўзьнікла выспа свабоды, дзе кожны ў рэальным часе мог ствараць мастацтва, вольнае ад любых абмежаваньняў. Кожны быў і мастаком і гледачом.

Правядзеньне акцыі ў цэнтры гораду мела сымбалічнае значэньне. Цэнтр Менску — месца найвялікшай рэглямэнтацыі. Вуліцы, прызначаныя для машынаў, міліцыянтаў і крутых буцікаў — вось у што ператвараецца ён паступова. Нармальныя чалавечыя адносіны зь цягам часу выціскаюцца ці заганяюцца ў межы, пазбаўляючы вуліцу яе спрадвечнай функцыі — месца чалавечых стасункаў. І нахабна захапіўшы частку гэтай прасторы, вярнуўшы ёй пачатковае прызначэньне, анархісты пасьпяхова завяршылі першы этап «Асваеньня».

Стварыўшы аазыс новых адносінаў і межасабовых стасункаў, ня згвалтаваных камэрцыяй ды сацыяльнай няпоўнасьцю, контркультурны бамонд перайшоў у наступ. Гэтым разам у наступ на самае сьвятое... Акцыя мела эпатажны назоў «Асваеньне апазыцыйнай дэманстрацыі» й была па даўно набалелай праблеме. Як вядома, моладзь, якая ў 1996 хваляй павалiла на апазыцыйныя мітынгі, ужо ў 1997 правалiла пратэстны ўздым масавым адтокам ад апазыцыйнай тусоўкі. Ёй стала проста нецікава. Ставячыся негатыўна да рэжыму Лукашэнкі, яна ўсё менш агульнага жадала мець з афіцыйнай апазыцыяй, якая увесь час падкрэсьлівала сваю прыхільнасьць да традыцыйнай мадэлі грамадскіх стасункаў. Той самай мадэлі, супраць якой выступалі дэманстранты, адмаўляючы навязаную ім пасыўную ролю.

